Весці БДПУ. Серыя 1. 2018. № 4. С. 118–122.

УДК 821.161.3 В. Казько

# ПРАБЛЕМА ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛЬНАЙ ЗАКІНУТАСЦІ Ў РАМАНЕ В. КАЗЬКО «БУНТ НЕЗАПАТРАБАВАНАГА ПРАХУ»

**А. А. Любчанка,**
*аспірант кафедры беларускай і замежнай літаратуры БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 15.10.18.

UDC 821.161.3 V. Kazko

# THE PROBLEM OF EXISTENTIAL ABANDONMENT IN THE NOVEL «REVOLT OF UNCLAIMED ASHES» BY V. KAZKO

**A. Liubchanka,**
*Post-Graduate Student of the Department of the Belarusian and Foreign Literature, BDPU*

Received on 15.10.18.

У артыкуле выяўляецца спецыфіка мастацкага даследавання праблемы экзістэнцыяльнай закінутасці ў рамане В. Казько «Бунт незапатрабаванага праху». Аналізуюцца вобразы галоўных герояў, у філасофскай парадыгме экзістэнцыялізму паказваюцца асаблівасці іх трансфармацыі. Звяртаецца ўвага на адметнасць асэнсавання іншых праблем: свабоды выбару, адчужанасці, адзіноты, адказнасці адной асобы перад грамадствам у цэлым.

*Ключавыя словы:* В. Казько, раман, «Бунт незапатрабаванага праху», экзістэнцыялізм, закінутасць, адзінота, свабода выбару, адчужанасць.

The article investigates the ways of reflecting the existential problems of abandonment in the novel «Revolt of unclaimed ashes» of the Belarusian writer V. Kazko. In this novel was considered the specifics of the transfer by the author of the internal state of the main characters through an inconsistent description of their way of life. Besides abandonment, in the work found other problems of existential philosophy: freedom of choice, loneliness and responsibility of one person to the community as a whole.

*Keywords:* V. Kazko, novel, «Revolt of unclaimed ashes», abandonment, existentialism, alienation.

Праблема экзістэнцыяльнай адзіноты і закінутасці з’яўляецца адной з маладаследаваных у літаратуразнаўстве. Часцей за ўсё асноўная ўвага пры разглядзе экзістэнцыяльных праблем у філасофскай прозе надаецца свабодзе выбару і адказнасці за яго. *Мэтай* нашага даследавання з’яўляецца раскрыццё праблемы экзістэнцыяльнай закінутасці ва ўсёй яе шматграннасці. Матэрыялам для даследавання паслужыў раман В. Казько «Бунт незапатрабаванага праху».

Творчасць В. Казько з-за сваёй структурнай разнастайнасці і філасофскай глыбіні ўжо даўно з’яўляецца прадметам даследавання многіх літаратуразнаўцаў. Па творах беларускага празаіка абаронены кандыдацкія дысертацыі Г. М. Друк («Фальклорна-міфалагічныя матывы ў творчасці Віктара Казько») і А. А. Васілевіч («Праблема міфалагізму ў сучаснай беларускай літаратуры (на матэрыяле прозы)»). Вывучэннем набыткаў празаіка займаюцца такія вучоныя, як Т. М. Тарасава («Сімволіка-міфалагічныя коды ў экзістэнцыяльнай прасторы аповесці В. Казько «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел»«), К. В. Кушнарова («Вяртанне да вытокаў як сімвал неўміручасці»), Г. В. Навасельцава («Абнаўленне прыёмаў паэтыкі рамана ў беларускай прозе XXI стагоддзя»), М. А. Тычына («Скарга непачутага крыку»), Л. У. Пярвушына («Постчернобыльские реалии в прозе В. Козько и Д. Делилло»), А. У. Крыклівец («Топас як увасабленне эвалюцыі або дэградацыі асобы ў прозе В. Казько і В. Астаф’ева») і інш. Даследчыкаў нязменна цікавяць філасофскія ідэі В. Казько, сімволіка і міфалагізм яго твораў, інтэртэкстуальнасць, аўтабіяграфічнасць, а таксама актуальныя праблемы рэчаіснасці, якія па-мастацку асэнсоўвае аўтар. На аснове сістэматызацыі навуковых работ папярэднікаў была выпрацавана метадалогія нашага даследавання, у якім зроблена спроба прасачыць адлюстраванне праблемы экзістэнцыяльнай закінутасці ў рамане «Бунт незапатрабаванага праху».

Віктар Апанасавіч Казько з’яўляецца адным з вядучых беларускіх пісьменнікаў сваёй генерацыі, якую часта называюць «сярэднім пакаленнем» ці пакален-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нем «шасцідзясятнікаў». Вайна заспела яго малым дзіцём і, безумоўна, пакінула след у душы. Пісьменнік нярэдка звяртаўся да ваеннай тэматыкі – рэтраспектыўна, не ставячы сябе ў адзін шэраг з аўтарамі «ваеннай прозы». Творам В. Казько ўласцівыя аўтабіяграфічнасць, глыбокі псіхалагізм і філасофская напоўненасць, а таксама пастаянны зварот да актуальных праблем чалавецтва, у тым ліку экалагічных («Неруш», «Цвіце на Палессі груша»). Аўтабіяграфічнасць твораў В. Казько яскрава праяўляецца і ў рамане «Бунт незапатрабаванага праху» (2009): галоўны герой твора, як і сам пісьменнік, у малым узросце спазнаў жахі вайны, пасля быў закінуты лёсам у Сібір і там пачуў покліч Бацькаўшчыны, неабходнасць вярнуцца да сваіх каранёў. Раман «Бунт незапатрабаванага праху» – гэта асабістая прастора В. Казько, дзе ён, «гуляючы» з мовай і часам, разважае як пра вечнае, так і пра актуальнае. Вось толькі некаторыя з адметных тэм рамана: жыццё і смерць, уласная свабода асобы і яе адчужанасць, роля чалавека ў гістарычным працэсе, узаемаадносіны паміж пакаленнямі, важнасць шанавання ўласных каранёў і прыродных скарбаў.

У цэнтры рамана В. Казько чалавек, які большую частку жыцця правёў далёка ад дома, што аб'ядноўвае яго з аўтарам рамана. Ён пабываў шмат дзе, «як і Віктар Казько некалі аб'ехаў Савецкі Саюз» [1]. Герой рамана сам па сабе з'яўляецца сімвалам закінутасці: «Ён даўно ўжо адчуваў, што вялікай неабходнасці ў ім гэты свет не ведае» [2, с. 9]. Галоўны герой жыве з адчуваннем унутранай спустошанасці, бо не ведае свайго сапраўднага імя, не ведае сапраўдных бацькоў і месца, дзе калісьці нарадзіўся. Пра гэта, згодна са складанай структурай рамана, чытач даведваецца пазней. Шмат год Германн (адзін з апошніх варыянтаў імя галоўнага героя) правёў у Сібіры, дзе працаваў і жыў разам з жонкай, якую, як аказалася, таксама ведаў недасканала. Раптоўна ў яго жыцці настаў перыяд, калі ён адчуў сваю бязроднасць і адзіноту як ніколі востра. Гэта адбылося ў вельмі сімвалічным узросце – 33 гады. Кожную ноч «скруха і адчай крышылі яго», ён з галавой акунаўся ў «кіпень адзіноты» [2, с. 8]. Германн усё больш і больш адчуваў здзічэласць і непрыкаянасць сваёй душы. Нешта не давала яму спакою, прымушала пакутаваць пры ўспамінах пра мінулыя дні, пра іх бессэнсоўнасць і бясплённасць.

Аўтар называе героя ёмістым словам – монстр. Тлумачэнняў, чаму В. Казько непарыўна звязаў галоўнага героя з вобразам монстра можа быць некалькі. Па-першае, сам аўтар піша: «Яго ўжо нідзе не было на зямлі, і быў ён на ёй паўсюдна» [2, с. 10]. Гэтыя словы яшчэ раз указваюць на згубленасць Германна, вобраз якога ўвасабляе пакаленне дзяцей вайны. Яго ўнутраныя праблемы і перажыванні можна лічыць тыповымі для тысяч людзей, што дзецьмі спазналі пакуты і страты, а потым, пасля заканчэння вайны, пачыналі дарослае жыццё на руінах збяднелай дзяржавы. Экзістэнцыяльныя праблемы закінутасці чалавека і адсутнасці свабоды выбару ў часы кардынальных змен праяўляліся вельмі востра, што таксама рабіла з чалавека неакрэсленую істоту, якая не магла самастойна вызначыцца з тым, дзе і кім ёй быць у жыцці. Па-другое, монстр сімвалізуе патаемны ўнутраны свет, які кожны чалавек, і Германн у прыватнасці, хавае ад вачэй іншых. В. Казько падкрэслівае, што чалавек рэдка спрабуе зазірнуць унутр сябе, усё больш аддаючыся спажыванню: «Спажывае і паліць з апантанасцю маньяка» [2, с. 12]. А ўнутры кожнага «драпежнік, монстр у галаве і сэрцы, за плячыма і на плячах» [2, с. 13]. Праз апісанне абагуленых вобразаў, і ў тым ліку вобраза Германна, В. Казько «выяўляе аўтарскае непрыманне заганаў рэчаіснасці» [3, с. 112].

Галоўны герой усімі сіламі намагаецца трымаць свайго монстра ў сабе, таму, быць можа, мае праблемы ў зносінах з людзьмі. Нават з уласнай жонкай ён не можа знайсці паразумення, бо занадта аддаецца барацьбе з унутранай пачварай, а таму пастаянна закрываецца ад любых кантактаў. В. Казько сцвярджае, што ён такі не адзін, бо «вар'яты на планеце амаль усе» [2, с. 13]. У кожнага свой монстр, і кожны хавае яго як можа, усё больш аддаляючыся ад рэальнага існавання і губляючыся ў штучнай рэчаіснасці, каб не звар'яцець канчаткова. Па-трэцяе, «Говар лічыць сябе сапраўдным монстрам, пачварай XX стагоддзя, што ўмудрыўся без каранёў з'явіцца на зямлі і недзе ўкараніцца» [3, с. 111]. З-за сваёй бязроднасці Германн не адчувае сябе паўнапраўным чалавекам. У сваіх жа вачах ён становіцца невызначанай істотай. Ён разумее, што веданне ўласных каранёў з'яўляецца найважнейшай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

каштоўнасцю для асобаснага развіцця кожнага чалавека і грамадства ў цэлым, бо «без маральных каштоўнасцей не можа існаваць і матэрыяльных» [3, с. 113]. А таму той, хто каранёў не мае, не мае і магчымасці для паўнацэннага развіцця ў свядомую асобу.

Германн разумее, што зможа ператварыцца ў свядомага чалавека, толькі вярнуўшыся да вытокаў уласнага існавання. Па гэтай прычыне, не вытрымаўшы душэўных пакутаў, галоўны герой вырашае пакінуць жонку, свой-чужы дом і адправіцца на пошукі малой радзімы, каб перастаць быць монстрам, які «разносіў вар'яцтва, што, нібыта пырнік, прарасло і ўкаранілася ў ім» [2, с. 18]. Па-чацвёртае, вобраз монстра цесна звязаны з Чарнобыльскай катастрофай, наступствы якой апісваюцца ў рамане. Монстр – прадукт забруджанай экалогіі, калі ўспрымаць яго літаральна ў дадзеным кантэксце. Калі разглядаць гэты вобраз сімвалічна, то відавочна, што монстрам з'яўляецца кожны, хто мае дачыненне да знішчэння свету. У больш шырокім экзістэнцыяльным сэнсе, кожны чалавек у нейкай ступені адказны за лёс усяго чалавецтва, а значыць кожны мае дачыненне як да перамог, так і да трагедый, якія з ім здараюцца. Таму монтр, якога зямля не змагла «стрэсці» «са свайго цела» [2, с. 14], можа жыць у кожным, што ставіць пад пагрозу далейшае існаванне і развіццё чалавецтва. Як заўважае літаратуразнавец П. В. Пярвушына, «автор настойчиво проводит мысль о том, что именно человек завел общество в тупик и принес беды земле» [4, с. 58].

Паслядоўнасць апісання падзей у рамане не мае вызначальнай ролі, бо, як сцвярджае Г. В. Навасельцава, «Віктар Казько адлюстроўвае не столькі падзеі, колькі характар галоўнага героя, тыповага прадстаўніка сваёй эпохі, паказвае актуальныя праблемы часу праз рэцэпцыю ўнутранага свету асобы» [3, с. 110]. Перад тым, як набыць сваё сапраўднае імя, ён пабыў Жорам, Юрам, Геркам, пасля ён сам перайменаваў сябе ў Гермaна, спачатку з адной «н», а потым з дзвюма.

На працы ў Сібіры, ужо ў сталым узросце, Германн атрымаў мянушку Кагор, яшчэ адно красамоўнае імя, якое было звязана з яго любоўю да адпаведнага напою і асацыіравалася з новым этапам жыцця галоўнага героя: моцным сяброўствам з Рабіновічам і Карповічам. Аднак яго лепшыя сябры загінулі пры трагічных абставінах, што схіліла Германна да новай хвалі роздумаў пра ўласную экзістэнцыяльную закінутасць і адзіноту. Цяпер ён страціў не толькі сябе, але і блізкіх яму людзей. Акрамя жонкі Надзеі, якой ён не рашаўся адкрыцца, ды бацькоў, што былі далёка, у яго не засталося больш нікога. Гэта ў значнай ступені падштурхнула Германна да новых пошукаў сябе, сваіх сапраўдных вытокаў у свеце. Яго жыццё падавалася яму несапраўдным усё больш і больш, калі скончылася яго ператварэнне з Геркі ў Германна. Якраз тады, разам з адчуваннем экзістэнцыяльнай закінутасці, у яго з'явіліся думкі пра ўласнае паходжанне. Цяжкі ўнутраны стан прымусіў героя звярнуцца да сваіх каранёў. «Хто ж ён на самай справе, дзе і калі нарадзіўся? І ці нарадзіўся?» [2, с. 51], – такія думкі ўсё больш турбавалі Германна. Гэта было не беспадстаўна, паколькі ён памятаў: «У мінулым сваім жыцці, яшчэ вясковым, краем вуха чуў нямала плётак і нагавораў на сябе» [2, с. 51]. Тыя плёткі былі звязаны з паходжаннем Германна, з яго сапраўднымі іменем і гісторыяй. Германн падазраваў, што яго імя і прозвішча яму «падсунулі». Хто яго бацька? Дзе яго Бацькаўшчына? Аказалася, што прыёмны бацька знайшоў хлопчыка ў лесе, калі ўцякаў ад ворагаў. Сапраўднае імя Жорыка-Юрыка-Германна – Макрыян, і бацька яго не Гаўрыла. Прыёмны бацька распавёў Макрыяну пра яго сапраўдны дом усё, што ведаў сам. Пасля гэтага галоўны герой адправіўся на сваю малую радзіму, каб здзейсніць мару ўсяго жыцця і нарэшце па-сапраўднаму ўкараніцца на роднай зямлі.

Закінутым чалавекам можна лічыць не толькі галоўнага героя – яго жонка Надзея таксама адчувала сябе недарэчнай у сучаснай ёй эпосе. Яна, аднак, не змагалася з унутраным монстрам. Праблемай Надзеі стала тое, што па яе ўласных адчуваннях, яна павінна была нарадзіцца стагоддзем раней: «Падсвядома цягнецца да мінулага жонка Говара Надзея, якой недастаткова духоўных здабыткаў свайго часу» [3, с. 113]. Яе сіла і неўтаймаванасць пачалі праяўляцца з малых год: «Магла даць па мордзе ляшча, паставіць на месца кожнага, хто спрабаваў замахнуцца на яе годнасць і незалежнасць» [2, с. 106]. Жыццё Надзеі суцэльна змяніў важны выпадак, калі недалёка ад яе дома знайшоўся клад – бутэлька з пасланнем ад дзекабрыстаў. Адметна, што дзяўчына прадчувала набліжэнне незвычайнай падзеі: «Веданне наперад было дадзена

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ёй таму, што яна вельмі хутка хадзіла, шмат бегала і, зразумела, няспынна ўвесь час думала, што з чаго можа атрымацца, як з кім і што будзе далей» [2, с. 118]. Такім чынам, па характары Надзея нагадвала мудрага і дзейснага змагара, што напрамую аб'ядноўвала яе з героямі XIX стагоддзя. Яна была ўпэўнена, што ліст ад дзекабрыстаў быў звернуты да яе. «А самой Надзьцы здавалася, што нараджаецца наноў» [2, с. 121]. Надзея нібы зразумела сваё прызначэнне, упэўнілася ў тым, што адчувала раней. Яна не думала пра тое, каб змяніць гэты свет ці арганізаваць рэвалюцыю, але «непрыкметна для самой сябе, яна занялася грамадскай дзейнасцю» [2, с. 125]. Ёй прадказвалі вялікую партыйную будучыню, «але нікому і ў галаву не прыходзіла, што на самай справе Надзя зусім іншая. Больш за тое, яе няма ўвогуле сярод гэтай мышынай тузаніны, гульні ў перадавікоў і выдатнікаў, актыву і пасіву. Яна цалкам і да канца знаходзіцца ў мінулым стагоддзі» [2, с. 126]. Надзя бачыла сябе гордай княгіняй Марыяй Мікалаеўнай Валконскай. Такім чынам, канчаткова адбылася змена ўнутранага стану Надзеі – ператварэнне ў асобу з іншай эпохі. Гэта метамарфоза сімвалічна супала з аднаўленнем яе роднай хаты. Змены ўнутры і звонку суправаджалі адна адну. Дзяўчына не супраціўлялася зменам, бо яны былі натуральнымі для яе: «Адразу і безагаворачна прыняла і падпарадкавалася таму свету і часу» [2, с. 126].

Найбольш значным і выразальным для Надзеі сутыкненнем з XX стагоддзем, можна назваць яе сустрэчу з Германнам, які з'яўляўся самым тыповым прадстаўніком гэтай эпохі. Надзея адмаўляла яго, як доўгі час адмаўляла рэчаіснасць, у якой ёй прыходзілася жыць. Яе прыняцце Германна можна лічыць прыняццем сучаснасці, згодай з тым, што яна не можа нарадзіцца наноў і вымушана мірыцца з цяперашнім быццём. У якасці свайго мужа Надзея бачыла дзекабрыста, але знайшла Жорку-Юрку-Герку-Германна-Макрыяна. Абодва яны – экзістэнцыяльна закінутыя людзі, толькі Надзея недарэчна закінута ў іншую эпоху, а Германн літаральна закінуты і пакінуты жыццём з першага дня свайго існавання. У канцы рамана яны, аднавіўшы ўзаемаадносіны, разам вяртаюцца на Палессе: «Яны жывуць сярод роднай палескай прыроды, няхай сабе і радыёфікаванай. Але яны шчаслівыя» [1]. Толькі пазбавіўшыся мітусні, яны здолелі адчуць унутранае супакаенне. Як адзначае Г. В. Навасельцава, «пісьменнік такім чынам пераканаўча даводзіць, што далейшае жыццё не мажлівае без духоўнага адраджэння чалавека» [3, с. 114]. Гэта датычыцца як кожнага чалавека паасобку, так і грамадства ў цэлым.

У рамане В. Казько нямала вобразаў-сімвалаў. Даследчыца А. У. Крыклівец звяртае ўвагу на топас дарогі як адзін з найбольш уплывовых у творы, бо ён адлюстроўвае складаны шлях галоўнага героя: «Шлях Германна Говара, які пакінуў бацькоўскі дом (страціў рай), духоўна спустошыўся ў "цывілізаваным" грамадстве і вярнуўся да родных каранёў, каб здабыць сябе, – алегорыя шляху ўсяго беларускага народа: яму неабходна здабыць сябе праз спазнанне вытокаў, гісторыі, шляхам вяртання ў мінулае» [5, с. 25]. Гэта заўвага напрамую звязана з наяўнасцю ў жыцці Германна некалькіх імёнаў. Лёс экзістэнцыяльна закінутага галоўнага героя ўвесь час быў звязаны з дарогай, бо да сталага ўзросту ён не мог знайсці свайго месца ў свеце. Вызначальнай часткай дарогі для Германна стаў мост, на якім ён спыніўся, вяртаючыся з архіву і не даведаўшыся праўды пра сваё паходжанне. Адметна, што вобраз маста мае міфалагічнае значэнне: «Міфалагізм становіцца асноватворным прыёмам і дапамагае раскрыць ідэйную канцэпцыю твораў, ён дамінуе ў рэалізацыі топасу дарогі і іншых ключавых топасаў» [5, с. 26].

Сімвалізм прысутнічае і ў назве рамана. Прах – усё, што застаецца пасля жыцця. Далей ёсць толькі памяць. Вобраз памяці ў рамане з'яўляецца звяном, якое спалучае жыццё са смерцю, і прымушае чалавека вяртацца да ўласных каранёў, што, згодна з В. Казько, мае вялікае значэнне для маральнага развіцця. Паступовы адрыў чалавека ад сваіх каранёў і прыроды вядзе да яго дэградацыі і згубленасці.

Як паказвае аналіз рамана «Бунт незапатрабаванага праху», у творы выяўляюцца тыповыя праблемы пакалення «дзяцей вайны»: страта сябе, адчуванне экзістэнцыяльнай закінутасці і адзінота ў пошуках уласнага «я». Германн Говар, які быў суцэльна згубленым чалавекам, прайшоў шлях ад маральнай спустошанасці да духоўнага адраджэння праз вяртанне да вытокаў свайго існавання. У творы знаходзіць адлюстраванне матыў блукання згубленага чалавека, якое павінна скончыцца там, дзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ён нарадзіўся. Згодна з В. Казько, вяртанне да каранёў дае надзею на знішчэнне бездухоўнасці і маральны ўздым у грамадстве. Праблема экзістэнцыяльнай закінутасці ўспрымаецца ў рамане як асабістая трагедыя чалавека, які меў няшчасце нарадзіцца не ў тым месцы і не ў той час: як Германн, без сапраўдных бацькоў і роднага дома, ці Надзея, закінутая ў неўласцівае для сябе асяроддзе. Разам з тым у творы знаходзіць адлюстраванне тэма негатыўнага ўплыву чалавека на экалогію, што сімвалізуе заняпад маральных каштоўнасцей ў грамадстве. Забруджванне навакольнага асяроддзя не спрыяе развіццю чалавека. Тэхнічны прагрэс заводзіць чалавецтва занадта далёка, асоба губляе маральныя арыенцiры, што вядзе да бязроднасці і спустошанасці, а значыць, – закінутасці. Актуалізацыя тэм жыцця і смерці, узаемаадносін паміж пакаленнямі, экзістэнцыяльнай свабоды чалавека і яго адчужанасці ўдакладняе і пашырае межы разважанняў аўтара пра месца чалавека ў свеце.


*Літаратура*

1. *Тычына, М.* Калі мёртвыя пачынаюць бунтаваць [Электронны рэсурс] / М. Тычына // News.21.by. – 2009. – 12 снеж. – Рэжым доступу: http://news.21.by/culture/2009/12/02/414655.html. – Дата доступу: 09.10.2018.
2. *Казько, В.* Бунт незапатрабаванага праху : раман / В. Казько. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 287 с.
3. *Навасельцава, Г. В.* Абнаўленне прыёмаў паэтыкі рамана ў беларускай прозе XXI стагоддзя (на прыкладзе твораў Віктара Казько «Бунт незапатрабаванага праху» і Юрыя Станкевіча «Ліст у галактыку «Млечны шлях») / Г. В. Навасельцава // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2016. – № 4 (97). – С. 110–114.
4. *Первушина, Л. В.* Постчернобыльские реалии в прозе Виктора Козько и Дона Делилло / Л. В. Первушина // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки: научно-теоретический журнал. – 2014. – № 10. – С. 65–72.
5. *Крыклівец, А.* Топас дарогі як увасабленне эвалюцыі або дэградацыі асобы ў прозе Віктара Казько і Віктара Астаф'ева / А. Крыклівец // Роднае слова. – 2011. – № 10 (286). – С. 24–27.

*References*

1. *Tychyna, M.* Kali myortvyya pachynayuts buntavats [Elektronny resurs] / M. Tychyna // News.21.by. – 2009. – 12 snezh. – Rezhym dostupu: http://news.21.by/culture/2009/12/02/414655.html. – Data dostupu: 09.10.2018.
2. *Kazko, V.* Bunt nezapatrabavanaga prakhu : raman / V. Kazko. – Minsk : Mast. lit., 2013. – 287 s.
3. *Navaseltsava, G. V.* Abnaulenne pryyomau paetyki ramana u belaruskay proze XXI stagoddzya (na prykladze tvorau Viktara Kazko «Bunt nezapatrabavanaga prakhu» i Yuryya Stankevicha «List u galaktyku «Mlechny shlyakh») / G. V. Navaseltsava // Izvestiya Gomeslkogo gosudarstvennogo universiteta imeni F. Skoriny. – 2016. – № 4 (97). – S. 110–114.
4. *Pervushina, L. V.* Postchernobylskiye realii v proze Viktora Kozko i Dona Delillo / L. V. Pervushina // Vestnik Polotskogo gosudarstvennogo universiteta. Seriya A, Gumanitarnyye nauki: nauchno-teoreticheskiy zhurnal. - 2014. – № 10. – S. 65–72.
5. *Kryklivets, A.* Topas darogi yak uvasablenne evalyutsyi abo degradatsyi asoby u proze Viktara Kazko i Viktara Astafyeva / A. Kryklivets // Rodnaye slova. - 2011. – № 10 (286). – S. 24–27.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ